Аб правядзенні абласнога
свята сямейнай творчасці
«Жывіце ў радасці»

З мэтай павышэння сацыяльнага статута, ролі і значнасці сям'і ў грамадстве, развіцця і папулярызацыі сямейнай мастацкай творчасці, зберажэння і пераемнасці нацыянальных сямейных традыцый, распаўсюджвання новых форм сямейнага побыту
ЗАГАДВАЮ:

1. Правесці абласное свята сямейнай творчасці «Жывіце ў радасці» (далей – абласное свята) у маі 2023 года ў г. Рэчыцы, прымеркаванае да Года міру і стварэння.

2. Зацвердзіць палажэнне, склад арганізацыйнага камітэта абласнога свята, форму заяўкі (дадаткі 1, 2).

3. Арганізацыю і правядзенне абласнога свята ўскласці на ўстанову «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці» (Сафрановіч Н.Д.), аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Рэчыцкага райвыканкама (Краўчанка С.Г.).

4. Фінансавыя выдаткі па арганізацыі і правядзенню абласнога свята ажыццявіць за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных установе «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці» на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2021-2025 гг.

5. Начальнікам аддзелаў (упраўлення) ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі раённых (гарадскога) выканаўчых камітэтаў аказаць садзейнічанне ў арганізацыйным забеспячэнні ўдзелу сем'яў у абласным свяце.

6. Кантроль за выкананнем дадзенага загада ўскласці на першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Заўгароднюю І.С.

Начальнік галоўнага ўпраўлення Д.У.Езерскі

Дадатак 1
да загада галоўнага ўпраўлення ідэадагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта
ад 2023 г. №

ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні абласнога свята сямейнай творчасці
«Жывіце ў радасці»

1. Мэты абласнога свята.
Абласное свята сямейнай творчасці «Жывіце ў радасці» (далей – абласное свята) праводзіцца ў мэтах:
павышэння сацыяльнай і творчай актыўнасці сям'і ў сацыяльна-культурнай грамадскай прасторы;
папулярызацыі культуры сямейных зносін, адраджэнню і развіццю сямейных традыцый, стварэнню спрыяльных умоў для творчай рэалізацыі талентаў членаў сям'і;
падтрымцы і стымулявання сямейнай мастацкай творчасці лепшых творчых сямей Гомельскай вобласці, актывізацыі дзейнасці ўстаноў культуры ў гэтым напрамку.
2. Кіраўніцтва абласным святам.
Для падрыхтоўкі і правядзення абласнога свята ствараецца абласны арганізацыйны камітэт, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама, установы «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці», аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Рэчыцкага райвыканкама.
У перыяд падрыхтоўкі абласнога свята аргкамітэт далучае сродкі масавай інфармацыі да асвятлення ходу абласнога свята, дапамагае ў яго правядзенні, ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва абласным святам у тэрмін правядзення мерапрыемства.
3. Умовы і парадак правядзення абласнога свята.
Абласное свята адбудзецца ў маі 2023 года ў г.Рэчыцы.
У абласным свяце прымаюць удзел не менш 2 калектываў ад раёна (г.Гомеля) сямейнай і сямейна-роднаснай (складзеныя з некалькі сем'яў) аматарскай творчасці па ўсіх відах і жанрах народнага мастацтва, у тым ліку дэкаратыўна-прыкладнога і пекарскага, незалежна ад месца пражывання і ўзросту ўдзельнікаў з абавязковым удзелам дзяцей і ўнукаў. Адна сям'я можа прыняць удзел у адной і больш намінацый.

Заяўкі на ўдзел у абласным свяце, зацверджаныя начальнікам аддзела (упраўлення) ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі раённага (гарадскога) выканаўчага камітэта, творчыя характарыстыкі сям'і дасылаюцца да 1 красавіка 2023 года на электронны адрас ltikdd@ocntgomel.by, установа «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці», аддзел аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці (форма заяўкі дадаецца).

4. Конкурсныя выступленні праводзяцца па наступных намінацыях:

сямейная аматарская творчасць (песеннае, харэаграфічнае, інструментальнае, тэатральнае мастацтва) – 2 творы любога віда мастацтва;

сямейная традыцыя (сямейная страва, пякарскае майстэрства) – экспазіцыя вырабаў ад кожнай сям'і размяшчаецца на пляцоўцы памерам да 3 кв. м. Абсталяванне для экспазіцыі забяспечваюць удзельнікі абласнога свята;

сямейныя захапленні (дэкаратыўна-прыкладное мастацтва) – экспазіцыя вырабаў ад кожнай сям'і размяшчаецца на пляцоўцы памерам да 6 кв. м. Абсталяванне для экспазіцыі забяспечваюць удзельнікі абласнога свята.

Прэзентацыя сем'яў у намінацыях «сямейная традыцыя» і «сямейныя захапленні» да 3 хвілін на кожную сям'ю.

5. Падвядзенне вынікаў абласнога свята і ўзнагароджванне.

Журы будзе ўлічваць:

выканаўчы ўзровень, сцэнічную культуру;

пазітыўную накіраванасць выступлення ўдзельнікаў;

наяўнасць сцэнічных традыцыйных народных касцюмаў;

мастацкі ўзровень вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

узровень афармлення выставаў і іх прэзентацыю;

наяўнасць сямейных традыцый, скіраваных на пераемнасць пакаленняў, замацаванне сувязей паміж прадстаўнікамі роду.

Па выніках конкурсных выступленняў, творчых прэзентацый журы вызначае пераможцаў у кожнай з трох намінацый з уручэннем дыпломаў і падарункаў:

дыплом I ступені і падарунак на суму ў памеры да 4 базавых велічынь;

дыплом II ступені і падарунак на суму ў памеры да 3 базавых велічынь;

дыплом III ступені і падарунак на суму ў памеры да 2 базавых велічынь.

Калектывы, не стаўшыя пераможцамі, узнагароджваюцца дыпломамі за удзел і падарункамі на суму ў памеры да 1 базавай велічыні.

Пры неабходнасці журы мае права прысудзіць не ўсе дыпломы, змяніць ці ўвесці дадатковыя намінацыі ў межах каштарысу. Рашэнне журы канчатковае і перагляду не падлягае.

Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне адбудзецца пасля завяршэння свята.

6. Фінансаванне.

Фінансавыя выдаткі па арганізацыі і правядзенню абласнога свята ажыццяўляюцца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных установе «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці» на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2021-2025 гг.

7. Камандзіровачныя і транспартныя выдаткі.

Транспартныя і камандзіровачныя выдаткі ўдзельнікаў абласнога свята ажжыцяўляюцца за кошт накіроўваючага боку.

8. Кантакты.

Адрас: 246022, г. Гомель, вул. Кірава, 49, установа «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці».

e-mail:ltikdd@ocntgomel.by

Кантактны нумар (0232) 33-73-02, аддзел аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці, Хахракова Таццяна Уладзіміраўна.

Дадатак 2
да загада галоўнага ўпраўлення
ідэалагічнай работы, культуры і
па справах моладзі Гомельскага
абласнога выканаўчага камітэта
ад 2023 г. №

СКЛАД
арганізацыйнага камітэта абласнога свята сямейнай творчасці
«Жывіце ў радасці»

| | |
|---|---|
| Заўгародняя Інга Сяргееўна | першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта |
| Сафрановіч Наталля Дзмітрыеўна | дырэктар установы «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці» |
| Краўчанка Святлана Генадзьеўна | начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Рэчыцкага райвыканкама |

ЗАЯЎКА
для ўдзелу ў абласным свяце сямейнай творчасці
«Жывіце ў радасці»

Намінацыя «Сямейныя захапленні»

1. Назва раёна
2. Прозвішча сям’і
3. Ведамасная прыналежнасць
4. Кантактны тэлефон
5. Від творчасці, пералік работ

Дырэктар установы

ЗАЯЎКА
для ўдзелу ў абласным свяце сямейнай творчасці
«Жывіце ў радасці»

Намінацыя «Сямейная традыцыя»

1. Назва раёна

2. Прозвішча сям'і

3. Ведамасная прыналежнасць

4. Кантактны тэлефон

5. Від, пералік страў

Дырэктар установы

ЗАЯЎКА
для ўдзелу ў абласным свяце сямейнай творчасці
«Жывіце ў радасці»

Намінацыя «Сямейная аматарская творчасць»

1. Назва раёна (горада)

2. Прозвішча сям'і, калектывы сямейнай і сямейна-роднаснай (складзеныя з некалькі сем'яў) аматарскай творчасці (кантактны тэлефон)

3. Назва калектыва (для калектываў)

| Назва твора | Аўтары музыкі і слоў | Хранаметраж | Від носьбіта музычнай фанаграмы |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |

4. Кантактны тэлефон

Дырэктар установы